**Дзень святога Андрэя ва Украіне: традыцыі святкавання**

*Н.А. Валатоўская, дацэнт кафедры тэарэтычнага
і славянскага мовазнаўства БДУ, кандыдат філалагічных навук*

Дзень святога Андрэя (Андрэя Першазванага) з'яўляецца адным з першых свят зімовага цыклу ўкраінцаў і адзначаецца 13-га снежня. Напярэдадні гэтага дня дзяўчаты звычайна варажылі пра сваю долю. Кожная незамужняя дзяўчына верыла, што "ноч Андрэя" дапаможа ёй зразумець сваю будучыню, даведацца, ці выйдзе яна на працягу года замуж. Існавалі розныя спосабы варажбы. Найбольш вядомы з іх – з дапамогай *балабушак*.

Балабушкі – гэта невялікія круглыя булачкі з пшанічнай мукі. Кожная дзяўчына павінна была абавязкова сама, без чыёй-небудзь дапамогі, спячы яе. Ваду для цеста трэба было прынесці з крыніцы не ў вядры ці місцы, а ў роце. Гэтым часта карысталіся хлопцы, якія спецыяльна збіраліся каля крыніц і чакалі там дзяўчат, каб рассмяшыць і тым самым перашкодзіць ім зрабіць задуманае. Пасля некалькіх няўдалых спроб данесці ваду да хаты дзяўчаты вымушаныя былі дамаўляцца з хлопцамі і мянялі сваю свабодную дарогу з вадой у роце на, напрыклад, міску варэнікаў. Пасля таго як кожная дзяўчына спячэ сваю балабушку, іх раскладалі на падлозе і ўпускалі ў хату сабаку, якога не кармілі цэлы дзень. Пры гэтым уважліва сачылі, што сабака будзе рабіць. Чыю балабушку ён з'есць першай, тая дзяўчына першай пойдзе замуж, чыю пакіне – тая застанецца яшчэ на год "у дзеўках", калі чыю-небудзь булачку пацягне хаваць у цёмны куток, значыць, лёс занясе тую дзяўчыну далёка ад бацькоўскай хаты. Самым горшым лічылася, калі сабака не з'ядаў балабушку, а толькі надкусваў яе.

Таксама дзяўчаты хадзілі па вёсцы і падслухоўвалі пад вокнамі суседзяў. Добрым знакам лічылася пачуць словы "ідзі", "уставай", "едзь" (яны азначалі, што дзяўчына хутка выйдзе замуж), дрэнным – словы "сядзі", "стой" і г.д.

Але дзяўчыне даведацца, што яна выйдзе замуж, было мала, яна хацела ведаць больш: як будуць зваць яе мужа, які ён будзе, чым будзе займацца. Каб даведацца імя, дзяўчына выходзіла на вуліцу і пытала першага мужчыну, якога сустракала, як яго завуць. Лічылася, што такое ж імя будзе і ў яе мужа.

Часам выкарыстоўвалі яшчэ адзін спосаб варажбы: насыпалі на падлогу трохі зерня, налівалі ў місачку вады, побач ставілі люстэрка і ўпускалі ў хату… пеўня. Калі ён п'е ваду – будучы муж будзе п'яніцай, клюе зерня – добрым гаспадаром, глядзіць у люстэрка – гультаём.

Фальклarыстамі зафіксаваны яшчэ адзін цікавы спосаб варажбы: бралі пеўня і курыцу, звязвалі іх разам хвастамі, накрывалі рэшатам і пакідалі на нейкі час, каб яны супакоіліся. Потым выпускалі і сачылі, хто каго перацягне. Па гэтым вызначалі, хто будзе галоўным у сям'і – муж ці жонка. У выніку варажбы, канечне, верылі, але найперш разглядалі яе як адзін са спосабаў добра правесці час перад святам.

На само свята святога Андрэя – Андрэеўскі вечар – дзяўчаты пяклі *каліту* (укр. *калита, калета*). Каліта ўяўляла сабой вялікі круглы корж з пшанічнай мукі, на ім выціскалі арнамент, упрыгожвалі яго сухімі вішнямі, разынкамі, арэхамі. Асаблівасцю каліты было тое, што ў працэсе прыгатавання цеста абавязкова ўдзельнічала кожная дзяўчына з прысутных. Цеста мясілі па чарзе, пачынаючы ад самай старшай і заканчваючы наймалодшай, нават калі гэта была дзяўчынка гадоў дзесяці, а то і менш. Выпякалі каліту так, каб яна была вельмі цвёрдай, падобнай да сухара.



Безумоўна, зараз ва ўкраінскіх вёсках традыцыі святкавання Андрэеўскага вечара і варажбы перад ім памятаюць хіба што бабулі і так весела, як раней, на жаль, не ладзіцца гэтае свята, як, дарэчы, і многія іншыя. Але існуюць разнастайныя народныя калектывы, якія не даюць знікнуць народным традыцыям. Удзельнікі аднаўляюць іх і дэманструюць на мерапрыемствах розных узроўняў. Не апошнюю ролю ў гэтай справе адыгрываюць навучальныя ўстановы.

Прапануем пазнаёміць беларускіх школьнікаў і студэнтаў з традыцыйным святам нашых паўднёвых суседзяў. Слухачам можна расказаць аб традыцыях варажбы напярэдадні свята (а магчыма, і паваражыць разам), аб асаблівасцях прыгатавання галоўнай абрадавай стравы, а пасля прапаваць узяць удзел у традыцыйным “кусанні каліты”.

Паўдзельнічаць у свяце святога Андрэя могуць студэнты і школьнікі любога ўзросту – папярэдняя падрыхтоўка праводзіцца з улікам іх узросту.

Праз каліту працягваюць чырвоную стужку і падвешваюць на вышыні (можна прывязаць да палкі, якую хто-небудзь будзе трымаць у руках). Каля каліты становіцца вартаўнік – спадар Каліцінскі. Гэта павінен быць вясёлы, кемлівы хлопец, душа вечара кампаніі. Ён бярэ ў рукі квач, які макае, напрыклад, у цукровую пудру (традыцыйна квач апускаўся ў сажу), становіцца пад калітой і запрашае:

– Я, спадар Каліцінскі, прашу спадара Кацюбінскага каліту кусаць!

Спадар Кацюбінскі (ім становіцца па чарзе кожны з удзельнікаў гульні) бярэ палку (раней гэта была качарга – укр. *коцюба*), умоўна сядае на яе як вершнік на каня, “едзе” да вартаўніка і кажа:

– Добры вечар, спадар Каліцінскі!
– Добры вечар, спадар Кацюбінскі! Куды едзеце?
– Еду каліту кусаць!
– А я буду па твары пісаць!
– А я ўкушу!
– А я ўпішу!

Гэтая размова адбываецца з жартамі і смехам. Задача спадара

Каліцінскага – рассмяшыць спадара Кацюбінскага, які мае права кусаць каліту толькі ў тым выпадку, калі ён вытрымае ўсе жарты і нават не ўсміхнецца. Гэта зрабіць вельмі цяжка, бо спадар Каліцінскі жартуе, спявае, танцуе – смяшыць усіх прысутных. Усе смяюцца, і толькі спадар Кацюбінскі павінен заставацца абсалютна сур’ёзным.

Самым цікавым з’яўляецца тое, што нават калі спадар Кацюбінскі вытрымае і не ўсміхнецца, паласавацца калітой ён усё роўна не зможа, бо калі ён падпрыгне, каб укусіць каліту, спадар Каліцінскі смыкне стужку – і каліта ўзляціць дагары.

Калі ж спадар Кацюбінскі ўсміхнецца, то спадар Каліцінскі мажа яго па твары цукровай пудрай (сажай), і спадар Кацюбінскі выходзіць з гульні. На яго месца прыходзіць наступны. Заканчваецца ўсё тым, што каліту знімаюць, рэжуць на кавалкі і разам частуюцца.

Зварот да нацыянальных традыцый мае вялікае выхаваўчае значэнне, бо дазваляе стварыць адмысловае асяроддзе, дзякуючы якому спасціжэнне моладдзю маральных і культурных норм і каштоўнасцей адбываецца нязмушана і таму не выклікае негатыўнай рэакцыі. Акрамя таго, знаёмства з культурнымі здабыткамі розных народаў, не толькі свайго, садзейнічае пашырэнню кругагляду, развіццю нацыянальнай самасвядомасці.

**Літаратура**

1. Воропай О. Звичаї нашого народу: етнограф. нарис / худож.-оформлювач Л. Д. Киркач-Осипова. – Харків: Фоліо, 2007. – 508 с.

2. Україна в словах: мовокраїнознав. слов.-довід.: навч. посіб. для учнів загальноосвіт. шкіл, ліцеїв, гімназій, студентів, усіх, хто вивчає укр. мову / упоряд. і кер. авт. кол. Н. Данилюк. – К.: ВЦ “Просвіта”, 2004. – 704 с.